**А. А. АКУШЭВІЧ,**
метадыст вышэйшай катэгорыі ўпраўлення вучэбна-метадычнай работы ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі»

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры

Сучасны этап развіцця грамадства вымагае ад настаўніка бесперапыннай адукацыі, гатоўнасці да пастаянных змен. Яшчэ нядаўна інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі былі перспектывай, а цяпер гэта рэальнасць. Сучасны вучань пастаянна звяртаецца да інфармацыі, якую вокамгненна выдае інтэрнэт. Сёння актуалізуецца пытанне кампетэнтнасці тых, хто навучае.

Існуюць розныя падыходы да трактоўкі паняцця «кампетэнтнасць педагога» [гл.: 1; 3]. У беларускім педагагічным дыскурсе вылучаюць найперш метадычную і прадметную кампетэнцыі настаўніка. Якасная метадычная работа на розных узроўнях сістэмы адукацыі бачыцца эфектыўным рэсурсам у падвышэнні прфесіяналізму педагогаў.

Узбагачэнне, пашырэнне педагагічнага доведу адбываецца на семінарах, круглых сталах, вэбінарах і інш. Станоўчы эфект і добры стымул для індывідуальнай траекторыі росту спецыяліста даюць інавацыйная педагагічная дзейнасць, удзел у конкурсах прафесійнага майстэрства. Важнае значэнне мае функцыянаванне метадычных аб'яднанняў установы адукацыі, раёна (горада).

У дзяржаўнай установе адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» створаны «Банк даных настаўнікаў кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст"» (*http://academy.edu.by/files/teapo/index.php*), да якога можна звяртацца пры арганізацыі майстар-класаў, урокаў для дарослых і інш. Такія мерапрыемствы накіраваны на абмен метадычным вопытам, садзейнічаюць фарміраванню і гуртаванню прафесійнай супольнасці.

Рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу — адзін з асноўных кірункаў педагагічнай дзейнасці настаўніка-філолага. Серыя «Кампетэнтнасны падыход» створана для метадычнай дапамогі настаўнікам беларускай мовы і літаратуры [гл.: 2]. У межах метадычнай работы неабходна таксама засяродзіцца на развіцці і фарміраванні рытарычнай, сацыякультурнай (вучэбны прадмет «Беларуская мова») і культуралагічнай, культуратворчай (вучэбны прадмет «Беларуская літаратура») кампетэнцый вучняў.

Рэкамендацыі па выніках рэспубліканскага маніторынгу якасці адукацыі будуць карысныя пры вызначэнні шляхоў фарміравання кампетэнцый вучняў. Развіццю іх чытацкай культуры садзейнічае і медыяадукацыя. Справу з медыятэкстамі вучні маюць штодня, таму ім трэба валодаць адпаведнымі навыкамі і ўменнямі. Настаўнік мусіць умець працаваць з інфармацыйна-камунікатыўнымі тэхналогіямі.

Рэалізацыя вучэбных праграм па прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» прадвызначае дзейнасць настаўніка-філолага. Педагогу варта надаць асаблівую ўвагу зместу абноўленых вучэбных праграм па беларускай літаратуры: пазнаёміцца з творамі і біяграфіямі аўтараў, якія раней не вывучаліся, з тэкстамі, што прапанаваны ў спісе для дадатковага чытання. На пасяджэннях метадычных аб'яднанняў рэкамендуецца разглядаць актуальныя пытанні методыкі выкладання беларускай літаратуры, сучаснага прачытання класікі, падыходы да аналізу твораў. Неабходна акцэнтаваць увагу на магчымасцях вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове і літаратуры, абмеркаваць вопыт іх эфектыўнага выкарыстання, а таксама прааналізаваць навуковыя кнігі і артыкулы, улучаныя ў вучэбную праграму. Пажадана рыхтаваць агляды значных метадычных навінак, публікацый у педагагічным друку.

Не страцілі сваёй значнасці дапрофільная падрыхтоўка і профільная адукацыя, што вымагае комплекснай, сістэмнай працы. На ўроках варта сярод іншага звяртацца да кампетэнтнасна арыентаваных, творчых і практыкаарыентаваных заданняў.

Эфектыўнае правядзенне кантрольна-ацэначнай дзейнасці — значны элемент прафесійнага майстэрства педагога. Выстаўленне

адзнак на вучэбных занятках залежыць ад сістэмы ацэньвання, якой прытрымліваецца настаўнік. У вучняў павінна быць магчымасць праявіць сябе на ўроку, таму настаўнік прапануе рознаўзроўневыя заданні, улічвае індывідуальныя здольнасці і асаблівасці кожнага вучня.

З філалагічна адоранымі і высокаматываванымі вучнямі вельмі важна наладзіць сістэмную дзейнасць, якая ўлічвае новыя дасягненні навукі, методыкі і педагагічнага вопыту. Неабходна скарыстоўваць магчымасці пазаўрочнай працы (навуковыя і літаратурныя гурткі, канферэнцыі, чытанні, гасцёўні і інш.).

Адну з ключавых роляў у падвышэнні прафесійнага майстэрства педагога адыгрывае самаадукацыя. Сучасныя тэхналогіі дазваляюць аператыўна знаёміцца з разнастайнай інфармацыяй (метадамі, прыёмамі, тэхналогіямі навучання і інш.). Відэахостынгі, адукацыйныя рэсурсы, выдавецтвы прапаноўваюць настаўніку ўсё больш і больш матэрыялаў. Аднак ставіцца да іх неабходна крытычна, бо не кожны адукацыйны прадукт, асабліва які не прайшоў належную экспертызу, будзе адпавядаць мэтам і задачам адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, узроставым асаблівасцям вучняў і інш. Інтэрнэт-прастора можа стаць крыніцай метадычных ідэй і штуршком да новых распрацовак, якія арганічна ўвойдуць у вучэбны працэс.

Педагог павінен знаёміцца з навукова-метадычнымі выданнямі, рэкамендаванымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Нацыянальным інстытутам адукацыі, мець магчымасць абмеркаваць свае творчыя напрацоўкі на пасяджэннях метадычных аб'яднанняў установы адукацыі, раёна або горада. Больш вопытныя калегі пры неабходнасці могуць аказваць кваліфікаваную падтрымку маладым спецыялістам і настаўнікам з невялікім педагагічным стажам.

Такім чынам, удасканаленне прадметна-метадычных кампетэнцый настаўнікаў — адна з умоў эфектыўнай дзейнасці ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Толькі кампетэнтны педагог здолее падрыхтаваць кампетэнтнага вучня.

**Спіс літаратуры**

1. *Асадуллин, Р. М.* К вопросу о формировании и развитии профессиональной компетентности педагога / Р. М. Асадуллин, Р. З. Галиуллина // Вестн. Челябин. гос. ун-та. — 2013. — № 26. — С. 120—123.

2. *Валочка, Г. М.* Беларуская мова. 7 клас: дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, І. У. Булаўкіна. — Мінск : Сэр-Віт, 2018. — 76 с.

3. *Шкатова, Т. Г.* Содержание профессиональной компетентности педагога / Т. Г. Шкатова // Ярослав. пед. вест. — 2010. — № 1. — С. 100—103.

**Н. Ф. СТУПЧЫК,**
настаўніца вышэйшай катэгорыі сярэдняй школы № 2 г. п. Зэльва,
член рэспубліканскага клуба «Крыштальны журавель»

# СКРАЙБІНГ І СТОРЫТЭЛІНГ як сродкі фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі на ўроках беларускай мовы і літаратуры

Мэта: мяркуецца, што па заканчэнні майстар-класа ўдзельнікі будуць ведаць, што такое «скрайбінг» і «сторытэлінг», мець уяўленне пра дыдактычныя магчымасці гэтых педагагічных тэхнік візуалізацыі інфармацыі для фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі на ўроках беларускай мовы і літаратуры, ведаць алгарытмы працы па вышэйназваных педагагічных тэхніках, умець ствараць скрайбы розных відаў, гісторыі ў тэхніцы сторытэлінг паводле алгарытму.